**Гоўзіч І.М.**

# Верш у прозе

**Верш у прозе** (ад фр. *poète en prose, petit poète en prose)* — невялікі лірычны твор у празаічнай форме; валодае такімі прыкметамі лірычнага верша, як невялікі аб'ём, павышаная эмацыянальнасць, звычайна бессюжэтная кампазіцыя (рудыментарны сюжэт), агульная ўстаноўка на перадачу суб'ектыўнага ўражання або перажывання, але не такімі сродкамі, як метр, рытм, рыфма. Варта адрозніваць менавіта па метрычнай прыкмеце верш у прозе ад форм, прамежкавых паміж паэзіяй і прозай, — рытмічнай прозы і верлібра.

Форма верша ў прозе ў еўрапейскай паэзіі склалася ў эпоху рамантызму, абапіраючыся на біблейскую традыцыю рэлігійнай лірыкі ў прозе і на французскі празаічны пераклад іншамоўных вершаў. Першымі узорамі вершаў у прозе прынята лічыць кнігу Алаізіуса Бертрана "Гаспар з цемры. Фантазіі ў манеры Рэмбрандта і Кало" (1842). Тэрмін "Верш у прозе" быў уведзены Шарлем Бадлерам у "Колерах зла" (1857). Верш у прозе ў рускай літаратуры атрымаў распаўсюджанне дзякуючы І. Тургеневу ў цыкле твораў 1878 — 1882 гг., І. Аненскаму і інш.

Да верша ў прозе адносяцца "Думкі ў дарозе" (1906) Якуба Коласа, творы Ядвігіна Ш. ("Васількі", "Раны"), М. Гарэцкага ("Стогны душы", "Максімава зязюля"), З. Бядулі ("Плач пралесак", "Пяюць начлежнікі", "Прытуліся ка мне"), а таксама лірычныя адступленні ў вялікіх празаічных творах. У сучасным літаратуразнаўчым дыскурсе існуе меркаванне, што названыя творы адносяцца да версэтаў, бо ў словазлучэнні верш у прозе два паняцці (верш і проза) узаемна выключаюць адно другое (В.П. Рагойша).

Літаратура

Литературный энциклопедический словарь под ред. В.М. Кожевникова, П.А. Николаева. — М.: 1987.

Рагойша В. Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці. — Мінск, 2009.

Рагойша В.П. Паэтычны слоўнік. — 3-е выд. — Мінск, 2004.

Рагойша В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : Дапам. — Мінск, 2001.